# Берагіня
## з'ява абярэгу народа

***Сярод нешматлікіх, на жаль, зараз фестываляў, якія праводзяцца ў нашай краіне, асаблівае месца займае фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня». Ён скіраваны на дзяцей і моладзь, на іх ідэалагічнае і патрыятычнае выхаванне шляхам далучэння да традыцый свайго народа. Пачынаючы ад фальклорных экспедыцый і да стварэння разнастайных самабытных творчых праграм у ходзе фестывалю ўдзельнікі аматарскіх калектываў навучаюцца старадаўнім народным танцам, ігры на музычных інструментах, ад носьбітаў мясцовых мастацкіх традыцый пераймаюць амаль забытыя аўтэнтычныя песні, казкі, легенды, паданні. У 2010 годзе гэтая яркая святочная дзея павінна адбыцца шосты раз.***

Фестываль «Берагіня» паўжды меў падтрымку Міністэрстваў культуры і адукацыі, Гомельскага аблвыканкама, Акцябрскага райвыканкама, Беларускага фонду культуры. Апякуецца фестывалем і камісія па справах ЮНЕСКА ў Беларусі.

Зараз вядзецца інтэнсіўная падрыхтоўчая праца, таму ў Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў 28 кастрычніка быў арганізаваны Рэспубліканскі семінар спецыялістаў па фальклоры абласных, раённых цэнтраў культуры, кіраўнікоў дзіцячых фальклорных калектываў «Падрыхтоўка ўдзельнікаў фальклорных калектываў да Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва "Берагіня"».

Для ўдзелу ў мерапрыемстве запрошаныя спецыялісты Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, начальнікі абласных упраўленняў культуры, спецыялісты па фальклоры абласных і раённых навукова-метадычных цэнтраў, выкладчыкі і навукоўцы вядучых вышэйшых і сярэдніх спецыяльных устаноў культуры Беларусі.

На семінары былі разгледжаныя пытанні падрыхтоўкі ўдзельнікаў фальклорных калектываў да Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня», арганізацыі і мастацка-творчых асноў VI Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня», а таксама арыгінальны вопыт аднаўлення і трансляцыі традыцыйнага мастацтва.

У вызначэнні і абмеркаванні праблемаў падрыхтоўкі да фестывалю найбольш важкую і адказную працу вядзе галоўны арганізатар, аўтар ідэі і распрацоўшчык канцэпцыі, вядомы ў краіне этнахарэограф Мікола Козенка, навуковец аддзела традыцыйнай культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, які абазначыў канцэптуальныя асновы практычнага аспекту турніру фальклорных калектываў як інавацыйнай формы трансляцыі традыцыйнага мастацтва.

(Заканчэнне на стар. 2)



*Мікола Козенка і Святлана Беразоўская*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

с. 1, 2.

# Берагіня – гэта бераг надзеі

*(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)*

Цікавымі для ўдзельнікаў семінара былі выступленні начальніка аддела культуры Акцябрскага райвыканкама Гомельскай вобласці Святланы Беразоўскай, загадчыка кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, кандыдата культуралогіі Вячаслава Калацэя і выкладчыка гэтай жа кафедры Таццяны Пладуновай.

Ірына Мазюк, метадыст аддзела традыцыйнай культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, прапанавала адразу два даклады: «Рэгіянальныя асаблівасці спеўнага выканальніцтва» і «Традыцыйнае ткацтва паясоў» з прэзентацыяй кнігі Веры Селівончык «Ткацтва на дошчачках».

На пасяджэнні круглага стала «Рэгіянальны вопыт аднаўлення і трансляцыі традыцыйнага мастацтва» абмяркоўваліся пытанні падрыхтоўкі зборніка вершаваных твораў, прысвечаных фестывалю «Берагіня». Прадстаўнікам рэгіёнаў было прапанавана дасылаць вершы ў «Краязнаўчую газету». У час гутаркі выявілася праблема афармлення і стварэння эмблемы, штандараў, сімвалаў калектываў для ўдзелу ў шэсці фестывалю і было падкрэслена, што афармляць усе назваными вышэй матэрыялы неабходна на беларускай мове.

Удзельнікі круглага стала звярнулі ўвагу на тое, што ў афіцыйных дакументах па справаздачах аб рабоце ўстаноў культуры няма графы «фальклорныя калектывы», дзе пазначаюцца танцавальныя фальклорныя калектывы, і падкрэслілі неабходнасць выпраўлення такой сітуацыі.

Спецыялісты Брэсцкага абласнога грамадска-культурнага цэнтра звярнуліся з просьбай ахарактарызаваць, якім чынам неабходна праводзіць Тыдзень фальклорных відэафільмаў на месцах. Прагучала пытанне ўключэння ў праграму фестывалю танцавальных параў з удзельнікамі ўзростам за 50 гадоў і дзяцей, якія па ўмовах правядзення фестывалю не падыходзяць для ўключэння ў турніры, але займаюцца ў калектывах. Мікола Козенка прапанаваў скласці графікі і планы правядзення такіх тыдняў у рамках VI Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» і фіксаваць дакументальна працэс правядзення названага вышэй мерапрыемства, а таксама падкрэсліў неабходнасць выканання ўмоваў фестывалю ў дачыненні да ўзросту выступоўцаў.

Актуальным было пытанне са Смаргоншчыны Гродзенскай вобласці ад выкладчыка школы мастацтваў і кіраўніка дзіцячага фальклорнага калектыву Алены Захаравай, якая ўзняла праблему захавання мясцовага стылю выканання танцаў.

Напрыканцы пасяджэння круглага стала былі падведзеныя вынікі работы семінара, выказаныя меркаванні слухачоў курсаў павышэння кваліфікацыі аб актуальнасці і надзённасці пытанняў, якія на ім уздымаліся, а таксама вынесеныя слушныя прапановы па ўдасканаленні далейшай работы па падрыхтоўцы і правядзенні VI Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня»:

1) падрыхтаваць у БДУ культуры і мастацтваў серыю фанаграмаў для суправаджэння конкурсу народнага танца ў рамках фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня»;

2) уключыць дзяцей-вучняў другога і трэцяга класаў у выступленні на фестывалі фальклорнага мастацтва «Берагіня».



Як бачым, знакаміты фестываль «Берагіня», што будзе ладзіцца на Гомельшчыне шосты раз, памаладзее, і, хочацца спадзявацца, атрымае падтрымку ад высокага кіраўніцтва, а галоўнае, удзячнасць людскую і добрыя ўражанні ад народных танцаў і спеваў, легендаў і паданняў, усяго таго, што з'яўляецца сапраўды народнай спадчынай Бацькаўшчыны.

*Галіна СУША*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ